№12 (217)
2007

# Права на волю

Праваабарончы бюлетэнь

## Уганаравалі і беларускіх журналістаў

**У Нобелеўскім інстытуце ў Осла адбылася ўрачыстая цырымонія ўзнагароджаньня прэміяй імя Герда Буцэрыюса. Сярод цяперашніх лаўрэатаў – беларуская газета “Наша Ніва”, беларускі моладзевы мультымедыйны праект “CD-mag”, а таксама тры выданьні ад Расеі і Азербайджану.**

**Як паведамілі ў журы конкурсу, да якога належаць вядомыя нямецкія і нарвескія журналісты ды грамадзкія дзеячы, уключна з дыпламатам Гансам-Георгам Вікам, традыцыйна пераможцамі конкурсу становяцца лепшыя выданьні і журналісты Усходняй Эўропы. Сёлета на атрыманьне прэміі прэтэндавалі 48 кандыдатаў. Паводле журы, “усе лаўрэаты зьяўляюцца вельмі сьмелымі людзьмі, паколькі вымушаныя працаваць ва ўмовах жорсткага ціску з боку ўладаў”**

**У мінулыя гады пераможцамі ад Беларусі былі агенцтва БелаПАН, газеты “Народная Воля”, “Свободные новости”, “Витебский курьер”, “Белорусский рынок”, “Брестский курьер”, “Белорусская деловая газета”, “Салідарнасьць”, журналісты Сьвятлана Калінкіна, Мікола Маркевіч, Ася Трацюк.**

## Назіраньне працягнецца

**Генеральны сакратар ААН Пан Гі Мун заявіў, што, нягледзячы на скасаваньне мандатаў сьпецдакладчыкаў для Беларусі і Кубы, гэтыя краіны ня вызваленыя ад абавязку паважаць Дэкларацыю правоў чалавека. Паводле Пан Гі Муна, ніводная краіна – малая ці вялікая – не пазьбегне назіраньня за сітуацыяй з правамі чалавека. Пан Гі Мун вітаў рашэньне сяброў Рады ААН стварыць універсальны механізм з дапамогай якога ва ўсіх 192 краінах ААН будзе праводзіцца рэгулярны маніторынг.**



Зьміцер ЛІСІЕНКА.

# Дзесяць дзён з жыцьця Зьмітра Лісіенкі

Рэпрэсіўная судовая машына таталітарнай дзяржавы паставіла чарговы рэкорд: моладзевы актывіст Зьміцер Лісіенка цягам дзесяці дзён быў асуджаны тройчы. Акрамя трох сутак адміністрацыйнага арышту юнак вымушаны быў папоўніць дзяржаўную кішэню амаль на мільён рублёў. Калі да гэтых судоў дадаць яшчэ некалькі чэрвеньскіх затрыманьняў актывіста за ўдзел у акцыях па абароне гістарычнай забудовы Гародні, дык можна скласьці дакладнае ўяўленьне аб партрэце неўрымсьлівага актывіста і барацьбіта супраць дзейнага рэжыму.

Вось кароткая хроніка чэрвеньскіх падзеяў.

6 чэрвеня: Зьміцер Лісіенка прыехаў з Гародні ў Віцебск, каб разам з мясцовымі актывістамі падтрымаць праваабаронцу Валерыя Шчукіна падчас судовага працэсу. У гэты ж дзень юнак быў затрыманы разам з іншымі актывістамі. Моладзь выйшла на ганак з партрэтамі вядомага журналіста і праваабаронцы, і міліцыянты схапілі некалькі чалавек.

7 чэрвеня: пачатак судовага паседжаньня у судзе Віцебскага раёну над Зьмітром Лісіенкам па абвінавачаньні ў непадпарадкаваньні міліцыі і за ўдзел у несанкцыянаванай акцыі. Лісіенка запатрабаваў адваката і сьведкаў, таму працэс быў адкладзены. Судзьдзя Віцебскага раённага суда Наталя Трацьцякова задаволіла хадайніцтва, і юнака адпусьцілі з-пад варты, уручыўшы позву на 11 чэрвеня.

9 чэрвеня: суд Кастрычніцкага раёну Віцебску пакараў моладзевага актывіста трымя суткамі арышту за графіці “Свабоду Казуліну”, якое класіфікавалася па артыкуле 17.1. КаАП РБ (дробнае хуліганства). Прычым судзьдзя Папкова у судовай пастанове вызначыла ступень правапарушэньня Лісіенкі, мякка кажучы, дзіўна і не зусім прафесійна: “…учинял надписи…в общественном месте, при этом действия происходили в ночное время, чем нарушался отдых и спокойствие граждан,… проявил явное не-

(Працяг на стар. 2)

*Праваабарончыя матэрыялы можна таксама прачытаць на сайтах: www.spring96.org; www.charter97.org; www.baj.ru*

# Еўрасаюз гатовы да супрацоўніцтва, але...

«Шматлікія выпадкі палітычных рэпрэсіяў прымушаюць сумнявацца ў гатоўнасьці Беларусі да дэмакратычных пераўтварэньняў» — такое меркаваньне выказаў у інтэрв'ю БелаПАН надзвычайны і паўнамоцны пасол Германіі ў Менску Марцін Хекер.

«Еўрасаюз неаднаразова заяўляў ураду Беларусі аб тым, што адной з перадумоваў для карэннага паляпшэньня адносінаў павінна быць вызваленьне ўсіх палітычных зьняволеных», — сказаў дыпламат. М.Хекер зазначыў, што з моманту прадстаўленьня дакументу «Што Еўрапейскі Саюз можа даць Беларусі» ў лістападзе 2006 году «былі сапраўды зробленыя асьцярожныя крокі да ўзаемнага збліжэньня, але дынаміка адсутнічае».

«Мы станоўча ўспрынялі вызваленьне палітычных зьняволеных Мікалая Статкевіча і Паўла Севярынца, аднак па ранейшаму не вызвалены іншыя палітзьняволеныя», — сказаў М.Хекер. Пры гэтым дыпламат назваў «станоўчымі крокамі» згоду беларускага боку на адкрыцьцё прадстаўніцтва Еўракамісіі, датэрміновае вызваленьне некаторых палітзьняволеных, падаўжэньне дагавору арэнды для Беларускага Хельсінскага камітэту, а таксама дадзеную паслу магчымасьць як прадстаўніку дзяржавы-старшыні ЕС наведаць Аляксандра Казуліна.

«Мы спрабавалі паўплываць на беларускі бок, каб ён прыняў неабходныя меры для выкананьня правоў незалежных прафсаюзаў, — зазначыў М.Хекер. — Мы спасылаліся на тое, што толькі пры канстатацыі гэтага факту Міжнароднай арганізацыяй працы Беларусь зможа захаваць гандлёвыя прэферэнцыі і пасьля чэрвеня 2007 году».

«Я спадзяюся, што беларускім грамадзянам не давядзецца плаціць за шэнгенскую візу больш, чым грамадзянам Расіі», — сказаў Марцін Хекер. Дыпламат нагадаў, што Еўрасаюз падпісаў з Расіяй пагадненьне аб спрошчанай працэдуры выдачы візаў. Згодна з гэтым дакументам, расійскія грамадзяне будуць плаціць за шэнгенскія візы 35 еўра. Аналагічнае пагадненьне падпісанае таксама з Украінай.

«Пагадненьне аб спрошчанай працэдуры выдачы візаў ЕС гатовы падпісаць і з Беларусьсю пры наяўнасьці пэўных перадумоваў, — сказаў М.Хекер. — Але такога кшталту супрацоўніцтва прадугледжвае выказваньне ўрадам Беларусі прыхільнасьці да дэмакратычных каштоўнасьцяў, павагі правоў чалавека і вяршэнства закону і гатоўнасьці да правядзеньня дэмакратычных рэформаў». Дыпламат падкрэсьліў, што Еўрасаюз «ясна заявіў» аб сваім імкненьні да супрацоўніцтва з Беларусьсю, якое дазволіць у тым ліку зьнізіць кошт візавых збораў.

Пры гэтым М.Хекер асабліва зазначыў, што кошт беларускай візы значна вышэйшы за кошт шэнгенскай, якая дазваляе ажыцьцяўляць паездкі ў 17 краінаў. «Кароткатэрміновая шматразовая віза каштуе ў пасольстве Беларусі ў Берліне 165 еўра, а за экспрэс-візу трэба заплаціць 315 еўра. Транзітная віза для паездкі ў Маскву і назад каштуе 105 еўра, — заўважыў М.Хекер. — Але з беларускай візай вось ужо некалькі гадоў нельга прыехаць нават у саюзную дзяржаву Расію».

## Артуру Фінькевічу пагражае турма

**Адміністрацыя Магілёўскай сьпецкамендатуры цягам дзесяці сутак мусіць вызначыць дысцыплінарнае пакараньне для Артура Фінькевіча за інцыдэнт, што адбыўся 26 чэрвеня. Для палітвязьня гэта можа скончыцца турэмным зьняволеньнем.**

**Інцыдэнт здарыўся ўвечары пасьля адбою, калі Артур зайшоў у суседні пакой па валідол. Супрацоўнікі камендатуры палічылі гэта парушэньнем рэжыму і запатрабавалі, каб хлопец напісаў тлумачэньне.**

**"Калі ўсё ж вырашаць даць мне спагнаньне, то гэта будзе значыць, што мяне перавядуць у сьледчы ізалятар, а потым у судзе новая крымінальная справа паводле 415 артыкулу Крымінальнага кодэксу (ухіленьне або парушэньне правілаў распарадку падчас адбыцьця пакараньня). Мяне могуць пакараць да трох гадоў пазбаўленьня волі", – кажа Артур Фінькевіч.**

**Артур Фінькевіч ад 29 чэрвеня мінулага году адбывае пакараньне ў Магілёўскай сьпецкамендатуры за палітычныя графіці. Ён ужо мае тры спагнаньні, якіх дастаткова, каб не падпасьці пад амністыю.**

# Дзесяць дзён з жыцьця Зьмітра Лісіенкі

*(Пачатак на стар. 1)*

уважение к обществу". Пэўна, фарба вывяргалася на плот са страшэнным грукатам і гэта замінала спаць цэлай вуліцы! Акрамя таго, судзьдзя нават не знайшла мужнасьці ўголас працытаваць зроблены надпіс "Свабоду Казуліну!"

9 чэрвеня: уначы Зьмітра Лісіенку зноў затрымалі, на гэты раз каля абласнога ўпраўленьня ўнутраных справаў, на будынку якога зьявіўся надпіс "Свабоду Шчукіну!".

11 чэрвеня суд Віцебскага раёну пакараў Зьмітра штрафам у памеры 20 базавых велічыняў. Судзьдзя Зубеня абвінаваціў Лісіенку ў непадпарадкаваньні міліцыянтам (артыкул 23.4 Адміністрацыйнага кодэксу Рэспублікі Беларусь) і абвясьціў прысуд аж а палове восьмай вечару. Падчас судовага працэсу судзьдзя прызнаў, што склад правапарушэньня па яшчэ адным пратаколе, складзеным на Лісіенку за ўдзел у несанкцыянаваным пікетаваньні, адсутнічае. Рэальна актывіст быў пакараны за тое, што заступіўся за дзяўчат, якіх зьбівалі міліцыянты падчас судовага працэсу над Валерыем Шчукіным. Менавіта за такую ж правіну – спробу заступіцца за дзяўчыну, якую гамілы ў чорным цягнулі ў аўтазак, 15 сутак атрымаў лідэр моладзі БНФ Алесь Каліта.

19 чэрвеня зноў жа ў судзе Кастрычніцкага раёну пасьля пераносу судовага паседжаньня, Лісіенку быў вынесены яшчэ адзін прысуд у выглядзе штрафу ў памеры 10 базавых велічыняў за графіці "Свабоду Шчукіну" на будынку абласнога ўпраўленьня ўнутраных справаў. Дарэчы, судзьдзя Ірына Смалякова перанесла першае паседжаньне з тае нагоды, што на судовы разгляд не зьявіўся адзіны сьведка з боку міліцыі Сафронаў, без якога справу разгледзець было немагчыма, паколькі ў судовых матэрыялах маюцца разыходжаньні. Так, у рапарце сьцьвярджаецца, што ў Лісіенкі былі знойдзеныя балончыкі з фарбай, а ў пратаколе гэтага няма. Таму судзьдзя прыняла рашэньне перанесьці суд. І вось 19 чэрвеня "абаронца закону" начыста адмяла прэзумпцыю невінаватасьці, і пры адсутнасьці сьведак вынесла пакараньне. Адзінай падставай для штрафу зьявіўся сам факт прыезду Лісіенкі ў Віцебск, што, на яе думку, пацьвярджае наяўнасьць у юнака матыву для ўчыненьня "крамольнага" надпісу.

Гэта толькі адзін месяц жыцьця і адзін лёс маладога чалавека… Аднак, нягледзячы на перасьлед і карную палітыку, нягледзячы на каласальныя ідэалагічныя намаганьні уладаў, якія прамываюць моладзі мазгі з дапамогаю грандыёзных акцыяў і мыльных пульхіроў накшталт БРСМу ды "Белай Русі", такіх змагароў на Беларусі становіцца болей і болей. Цынізм і хцівасьць існуючай судовай сістэмы – яе слабасьць і безабароннасьць перад аб'ектыўнымі працэсамі, што непазьбежна сьпеюць у грамадстве.

# Тацяна СЕВЯРЫНЕЦ:
# "Я буду ісьці датуль, дакуль хопіць сілаў і будзе сэнс"

***Віцебскай настаўніцы Тацяне Севярынец суд адмовіў у праве аднавіцца на працы. Большасьць яе знаёмых лічаць звальненьне палітычна матываваным. Інтэрнэт-партал bulletinonline.org зьмясьціў інтэрв'ю з Тацянай Севярынец – маці вызваленага ня так даўно палітвязьня Паўла Севярынца.***

***– Пасьля таго, што зрабілі спачатку з Паўлам, а цяпер і з Вамі, – ёсьць, засталася яшчэ вера ў дабро, справядлівасьць, праўду?***

– Чаму ж не – трэба заўсёды верыць у перамогу дабра над злом. Рана ці позна гэта абавязкова адбудзецца.

***– Вы – ахвяра рэжыму ці проста лёс так склаўся?***

– На жаль, відаць – першае. А лёс... Ён так склаўся, што ў мяне выдатныя сын і муж, якія мне вельмі дапамагаюць і падтрымліваюць, а вось на працы побач апынуліся зусім іншыя людзі і начальнікі...

***– Чые словы падтрымкі сталіся для вас абсалютна нечаканымі?***

– Ліст аднакласьніка, які зараз жыве ў Ізраілі, гэта Навум Вадніцкі.

***– А вашыя вучні й бацькі як зрэагавалі на сітуацыю са звальненьнем?***

– На бацькоўскім сходзе ў прысутнасьці прадстаўніка адміністрацыі школы сабралі подпісы на падтрымку, аднесьлі ў рана, запісаліся на прыём да яго начальніка. І дзеткі напісалі ліст да майго шэфа, каб мяне пакінулі іхняй настаўніцай і класным кіраўніком. Нечакана, прыемна і кранальна.

***– А ў калегаў як з пачуцьцём салідарнасьці?***

– Нічога дрэннага не хачу пра іх гаварыць. Паважаю: гэта прафесіяналы. Мая сітуацыя іх напалохала, зьдзівіла, хоць шмат хто можа і даўно чакаў гэтага. Не спадзяваўся. А проста ведалі, якую я трымаю пазіцыю ў адносінах да ўладаў, і вось – адбылося! Але канстатавалі тое не з палёгкай, а са спачуваньнем. Ня ўсе, аднак многія.

Але я заўсёды лічыла, што настаўнік – яшчэ і сумленьне пакаленьня, якое ён выхоўвае. Таму ня маем права хлусіць дзецям: казаць адно, а рабіць інакш. У гэтай сітуацыі мяне падтрымалі адзінкі. А прафкам, які я адстойвала тры гады таму – іх тады хацелі разваліць, наагул “здаў” мяне. Хоць менавіта па маёй ініцыятыве некалі адбыўся сход, на якім сказала: “Людзі, гэта адзінае, што можа нас абараніць, паглядзіце што вакол робіцца! “ І вось той самы прафкам даў начальніку рана згоду на маё звальненьне. Старшыня камітэту пачынала з таго, што, маўляў, ніколі ня пойдзе на такі крок. Праз нейкі час паправілася: дам згоду... І дала. Я прама ім сказала: сёньня вы мяне не падтрымалі, заўтра ўжо некага з вас, як хоць крышачку аступіцеся, коса глянеце на начальства. Аднак і пасьля гэтых словаў з васьмі прысутных шэсьць прагаласавалі супраць мяне, а два ўстрымаліся. Зараз баяцца глядзець мне ў вочы. Ведаеце, як суцяшалі іншыя з іх? “Ты моцная, а мы пешкі”... Гм, дык жа вы тады і пешкі ў школьным класе! Дзеці, дарэчы, тое бачаць.

Я шкадую, што мне даводзіцца пакінуць сваю працу, якой аддадзена столькі гадоў. Не кажу, што мне лёгка – не, мне вельмі цяжка. Але дзеля тых дзетак, якія мяне падтрымалі, дзеля іхніх бацькоў я буду ісьці датуль, дакуль хопіць сілаў і будзе сэнс.

***– Як зрэагавалі вашыя калегі на скарачэньне беларускамоўнага выкладаньня ў школах, выцісканьне “апазіцыйных” класікаў з праграмы па літаратуры? Ці прынята ў вашым асяродку размаўляць па-беларуску?***

– Настаўнікі беларускай мовы карыстаюцца ёй, напрыклад, на метадычным савеце, а ў астатнім жыцьці больш гавораць па-расейску. Адпаведна, якое ўжо абурэньне з нагоды “праполкі” праграмы. З выключэньняў магу нагадаць хіба выдатнага педагога Мікалая Канстанцінавіча Яраша – на жаль, яго ўжо няма з намі. Але дзякуючы яму дзеці вельмі палюбілі беларускую мову і шмат хто з іх размаўляў па-беларуску. І шмат хто пайшоў у тагачасны Малады Фронт. Але зараз настаўнікаў, якія б сьвядома адчувалі сябе беларусамі, ганарыліся тым, малавата.

***– Ці заўсёды вы разумелі свайго сына?***

– Старалася – ён мне вельмі дарагі з маленства, бо нарадзіўся пасьля двух дзяўчынак... Таму імкнулася выхаваць сьмелым, мужным і заўсёды падтрымлівала.

***– І павагу да хрысьціянства прывілі?***

– Каштоўнасьці ў нас у сям’і былі агульначалавечыя: не хлусі, не крадзі. Стаўся да людзей так, як хочаш, каб яны да цябе ставіліся, і гэтак далей. А ўжо да рэлігіі ён прыйшоў сам. Да гэтага Паўла прывялі выпрабаваньні, якія даў яму лёс.

***– Чаму сёньня вучыцца маці ў свайго ўжо дарослага сына-змагара?***

– Мужнасьці, цярплівасьці, пазіцыі цьвёрдай, непарушнай, чэснай – дрэнная была б я маці, каб выхавала сына, у якога з часам нічому не магла б навучыцца. Цяпер ён хутчэй за мяне расьце ў духоўным плане, а я ўсьлед за ім цягнуся.

***– Некалі ваш сын Павел шмат казаў ня толькі пра “хрысьціянізацыю беларусаў”, але і пра “беларусізацыю хрысьціянаў”. Аднак ня дужа заўважаю, каб з апошнім нешта пачало мяняцца. Чаму працэс калі й ідзе, то вельмі марудна?***

– На жаль, тыя, хто жыве на Беларусі, мала адчуваюць сябе беларусамі. Вось калі зразумеюць, хто яны такія, што за зямля іх корміць, калі яны пачнуць ганарыцца сваім беларускім паходжаньнем, тады гэты працэс пойдзе хутчэй. Семдзесят гадоў зьнішчэньня беларускай мовы, ненармальнага разьвіцьця беларускае культуры і літаратуры заселі, як кажуць, у каранях. Таму зараз выпраўленьне сітуацыі ідзе марудна. Але – ідзе. Малыя мае дзеткі вельмі цікавяцца беларускім словам, таму і карыстаюцца папулярнасьцю новыя мерапрыемствы пад лозунгам “Размаўляй па-беларуску!“ Усё ў сэрцах і галовах людзей...

***– Хіба ці ня самы вядомы публічны палітык-хрысьціянін Павел Севярынец шмат заклікаў адмовіцца ад вулічнага пратэсту на карысьць асьветніцтва праз прызму хрысьціянскіх духоўных каштоўнасьцяў. Але моладзь да гэтага ў масе сваёй аднеслася насьцярожана. І сядзеў Павел усё ж за "вуліцу"... Дык што: радыкалізм не для хрысьціянскіх дэмакратаў?***

– Каб ісьці на вуліцу, трэба добра ведаць, дзеля чаго? З чым туды ідзеш? Каго павядзеш за сабой? Бо аднаму – нельга. Трэба ісьці разам. Побач з тымі, хто ў цябе верыць, хто ў сябе верыць. Тое, што зразумеў мой сын, дойдзе і да маладзенькіх хлопчыкаў, якія яшчэ мала чаго перажылі. А Павел заўсёды на "вуліцы", калі гэта патрабуецца. І з вуліцы яго ўзялі, свае выпрабаваньні ён прайшоў за акцыі на ёй.

***– Ці даводзілася вам быць сябрам выбарчай камісіі ў школе?***

– Калі Паша ішоў на парламенцкія выбары, я першай прынесла заяву ў акруговую камісію. Сабрала 130 подпісаў дзеля гэтага. Але, зразумела, мяне ня ўзялі... Таму з 2000 году я ў розных якасьцях бяру ўдзел у выбарчых кампаніях. Працавала ў камандах Домаша, Мілінкевіча. Апошні, дарэчы, прыехаў і дзень хадзіў са мной па

(Працяг на стар. 7)

# Дэкрэты вышэй за кодэкс...

## *Барацьба супраць кантрактнай сістэмы будзе працягвацца*

Першага траўня пасьля святочнага мітынгу з нагоды Дня працы адбыўся ўстаноўчы сход арганізацыйнай групы за правядзеньне рэферэндуму пра адмену ў Беларусі кантрактнай сістэмы. У выпадку станоўчага рашэньня Цэнтрвыбаркаму ініцыятыўная група, у якую ўвайшлі ўвайшлі 500 чалавек – прадстаўнікі палітычных партыяў, грамадзкіх аб'яднаньняў і незалежных прафсаюзаў, павінна будзе цягам месяцу сабраць ня менш за 50 тысячаў подпісаў грамадзянаў. 25 траўня ўсе дакументы па рэгістрацыі групы для збору подпісаў былі перададзеныя ў Цэнтрвыбаркам.

Нагадаем, што згодна з дэкрэтам прэзідэнта, часовыя кантракты павінны быць падпісаныя наймальнікам з кожным працоўным. Пры гэтым кантракт можа не падаўжацца без тлумачэньня прычынаў. Незалежныя прафсаюзы адразу ж назвалі гэткую кантрактную сістэму рабскай і пачалі з ёю змагацца. Старшыня прафсаюзу работнікаў радыёэлектроннай прамысловасьці (РЭП) Генадзь Фядыніч так сказаў пра мэты гэтай барацьбы.

— Мы дабіваемся дзьвюх мэтаў. Па-першае, гэта зьмяненьне кантрактнай сістэмы, каб яна адпавядала міжнародным стандартам і кантракты заключаліся толькі з прадстаўнікамі тых прафесіяў, дзе гэта неабходна. Напрыклад, з дырэктарамі, бухгалтарамі, а рабочыя, урачы, настаўнікі ды іншыя працавалі без кантрактаў. Другой мэтай мы ставім ратыфікацыю беларускімі ўладамі Канвенцыі Міжнароднай арганізацыі працы № 158, якая прадугледжвае перавод працоўнага на бестэрміновы кантракт адразу пасьля таго, як скончыцца яго выпрабавальны тэрмін па першай дамове.

Як паведаміла юрыст прафсаюзу РЭП Алена Яськова, адна з распрацоўшчыц законапраекту, у Працоўны кодэкс прапануецца ўнесьці зьмяненьні, згодна з якімі іншыя прававыя акты, якія пагаршаюць стан працоўных, ня будуць мець сілы, а ратыфікацыя Канвенцыі МАП павінна замацаваць прымат міжнароднага права над нацыянальным заканадаўствам.

— Калі два гэтыя законы будуць прынятыя парламентам, кантрактная сістэма павінна быць нівеляваная, а працоўныя вернуцца ў межы дзеяньня Працоўнага кодэксу з гарантыямі, кампенсацыямі і гэтак далей. Таму што зараз у нас у галіне працоўных адносінаў дыскрымінаванае амаль усё працоўнае насельніцтва краіны.

Старшыня Цэнтрвыбаркаму Лідзія Ярмошына пацьвердзіла Радыё Рацыя, што праверка законнасьці стварэньня ініцыятыўнай групы падыходзіць да канца.

— Гэта патрабаваньне закону. Мы павінны цягам месяцу праверыць законнасьць утварэньня ініцыятыўнай групы, а Міністэрства юстыцыі — даць свае меркаваньні пра сам законапраект.

Паводле Ярмошынай, праверка ажыцьцяўляецца шляхам тэлефанаваньня сябрам ініцыятыўнай групы. А да некаторых з падпісантаў прадстаўнікі выканаўчай улады, па даручэньні Цэнтрвыбаркаму, прыходзяць і асабіста.

Што да заключэньня Міністэрства юстыцыі, то, як паведаміла Алена Яськова, ад гэтай установы ніякіх зьвестак арганізатары ня маюць, хоць і прайшоў ужо амаль месяц.

27 чэрвеня стала вядома, што Цэнтрвыбаркам адмовіў у рэгістрацыі ініцыятыўнай групы па зборы подпісаў для ўнясеньня зьменаў у працоўнае заканадаўства. Сябры камісіі спасылаліся на тое, што парадак утварэньня ініцыятыўнай групы быў парушаны.

Паводле заключэньня Міністэрства юстыцыі, прапанаваныя ініцыятыўнай групай зьмены ў заканадаўства не адпавядаюць Канстытуцыі.

"У нашай краіне вышэй за ўсё ставяцца дэкрэты, а не Працоўны кодэкс. Людзям адмовілі ў грамадзянскай ініцыятыве, аднак відавочна, што бальшыня хоча працаваць без нявольніцкіх кантрактаў. Гэтым рашэньне ўлады не зьняло праблему кантрактаў, а яшчэ болей яе абцяжарыла", – заявіў Генадзь Фядыніч.

# Закон накіраваны на дапрацоўку

19 чэрвеня адбылося першае абмеркаваньне праекту закону "Аб інфармацыі, інфарматызацыі і абароне інфармацыі". Ад Беларускай асацыяцыі журналістаў прыняць удзел у дапрацоўцы рэдакцыі закону "Аб інфармацыі, інфарматызацыі і абароне інфармацыі" запрошаны доктар юрыдычных навук, кіраўнік Цэнтру прававой абароны СМІ Міхаіл Пастухоў. Пасяджэньне працоўнай групы ладзілася на базе парламенцкай камісіі па прамысловасьці, паліўна-энергетычнага комплексу, транспарту, сувязі і прадпрымальніцтва.

Менавіта гэтая камісія рыхтавала тэкст законапраекту. Разгляд яго быў запланаваны на сёлетнюю вясновую сесію беларускага парламенту. Але пасьля абмеркаваньня стваральнікі накіравалі закон на дапрацоўку.

Распрацоўшчыкі праекту закону сустрэліся з прадстаўнікамі установаў і арганізацыяў, якія выказалі зацікаўленасьць да гэтай праблематыкі: Нацыянальнага цэнтру заканатворчай дзейнасьці, Інстытуту праблемаў інфарматыкі НАН, юрфаку БДУ, ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" і інш.

Працоўнай групе ў складзе 10-12 чалавек прапанавана сустракацца раз на тыдзень і паэтапна абмяркоўваць кожны артыкул Закону аб інфармацыі, выказваць свае заўвагі. За аснову працы ўзятая зводная табліца заўвагаў і прапановаў да гэтага законапраекту, якую падрыхтавалі сьпецыялісты Галоўнага дзяржаўнага прававога ўпраўленьня пры Адміністрацыі прэзідэнта.

"Канцэптуальна закон не абмяркоўваецца, пытаньне яго мэтазгоднасьці таксама не ўздымалася. Нам прапанавана выказваць заўвагі па тэксьце падрыхтаванага праекту", – паведаміў прэс-службе БАЖ Міхаіл Пастухоў па выніках першага паседжаньня працоўнай групы.

Удзельнікі працэсу разгледзелі першы артыкул праекту закону "Аб інфармацыі, інфарматызацыі і абароне інфармацыі".

"Як станоўчы факт можна адзначыць тое, што законапраект накіраваны на дапрацоўку, – кажа намесьнік старшыні БАЖ, юрыст Андрэй Бастунец, які прымаў удзел у падрыхтоўцы асноўных заўвагаў і прапановаў да гэтага законапраекту ад БАЖ.

Але, па яго словах, у табліцы, што прапанавана да разгляду працоўнай групы, толькі шэраг лакальных прапановаў. А праект, на думку А.Бастунца, трэба перапрацоўваць прынцыпова.

"Да таго ж, з усімі заўвагамі і прапановамі, якія юрысты БАЖ выклалі на 8 старонках, у гэтай зводнай табліцы супадаюць толькі 5, і тое ня ў поўнай меры, – зьвяртае ўвагу А.Бастунец.

Нагадаем, пасьля запыту ў беларускі парламент БАЖ сёлета ў красавіку атрымаў тэкст праекту закону "Аб інфармацыі, інфарматызацыі і абароне інфармацыі". У суправаджальным лісьце прапаноўвалася "прыняць удзел у дапрацоўцы дадзенага законапраекту ў складзе працоўнай групы". У юрыстаў БАЖ узьніклі пытаньні практычна да кожнага артыкулу законапраекту. І ў неабходны тэрмін яны падрыхтавалі свае заўвагі і прапановы па ўдасканаленьні рэдакцыі закону.

# Сябры падтрымліваюць надзею ў нашых сэрцах...

26 чэрвеня ў судзе Цэнтральнага раёну г. Менску адбылося судовае паседжаньне па справе грамадзянінна Польшчы Яраслава Лукасіка аб прызнаньні незаконным рашэньня начальніка Цэнтральнага РУУС, згодна з якім пратэстанцкі прапаведнік быў пакараны адміністрацыйным штрафам за правядзеньне несанкцыянаванага богаслужэньня і дэпартаваны з Беларусі.

На судовы разгляд скаргі ня быў дапушчаны адвакат Яраслава Лукасіка. Судзьдзя Тацяна Паўлючук патлумачыла гэта тым, што прадстаўленая даверанасьць дазваляе ўдзельнічаць адвакату толькі ў грамадзянскіх справах.

Нягледзячы на тое, што каля 20 чалавек, у тым ліку і консул Польшчы, прыйшлі, каб папрысутнічаць на судовым паседжаньні, судзьдзя не паведаміла пра пачатак слуханьняў, і разгляд скаргі адбыўся фактычна ў адсутнасьць прадстаўнікоў з боку Яраслава Лукасіка. Менавіта ў гэты час разглядалася пытаньне аб дэпартацыі. Чацьвёра з прысутных змаглі патрапіць толькі на заканчэньне працэсу і заслухалі апошняга з трох сьведкаў-міліцыянтаў па факце правядзеньня несанкцыянаванага богаслужэньня. Як адзначыла жонка пастара Наталя Лукасік, міліцыянт блытаўся ў сваіх сьведчаньнях, таму яны ніяк ня могуць служыць доказам віны яе мужа. На завяршэньне судовага разгляду судзьдзя зачытала, што таксама да матэрыялаў адміністрацыйнай справы далучаны гуказапіс пропаведзі Яраслава Лукасіка, прадстаўлены сьпецслужбамі, і нібыта матэрыялы з інтэрнэту, якія сьведчаць пра ўчыненае пратэстанцкім пастарам правапарушэньне.

У выніку, судзьдзя Тацяна Паўлючук вырашыла адмовіць Яраславу Лукасіку ў задавальненьні скаргі на пастанову Цэнтральнага РУУС Менску і прызнала ягоную дэпартацыю законнай.

Жонка пратэстанцкага прапаведніка, грамадзянка Беларусі Наталя Лукасік лічыць, што разгляд быў аднабаковы, неаб’ектыўны і некампетэнтны. Да таго ж ім не паведамілі загадзя пра маючае адбыцца судовае паседжаньне, як гэта прадугледжана дзеючым заканадаўствам, а даведалася яна пра яго выпадкова, пазваніўшы напярэдадні ў канцылярыю суда. “Безумоўна, мы ня згодны з прынятым рашэньнем Цэнтральнага райсуда і будзем абскарджваць яго, далей дамагацца справядлівасьці”, – зазначыла Наталя Лукасік.

Нагадаем, што пастар царквы «Ян Прадвесьнік» Яраслаў Лукасік на пачатку чэрвеня быў дэпартаваны з Беларусі за сваю дзейнасьць у абарону рэлігійнай свабоды і цяпер жыве ў Польшчы. Польскае радыё для замежжа зьвязалася з пастарам і запытала, як ён сам ацэньвае сітуацыю, у якой апынуўся.

– Пакуль я знаходжуся на Падляшшы, дома ў маіх бацькоў, – сказаў Я. Лукасік. – Стараюся неяк арганізаваць сваю працу, таму што ня веру ў гэтыя савецкія суды і думаю, што там ужо ўсё даўно за мяне вырашана. Ніхто не зьбіраецца вярнуць мяне ў Беларусь. Але ўсё роўна змагацца трэба, пратэставаць трэба. Такім чынам, я стараюся арганізаваць сваю працу на эміграцыі.

Я меў духоўнае адчуваньне, калі мяне выганялі, што ўсё адбываецца пад кантролем Госпада, і з гэта будзе выцягнутае значнае дабро. Што датычыць агульнай грамады, то ўся гэтая вельмі сур’ёзная канфрантацыя, асабліва паміж евангельскімі хрысьціянамі і ўладамі ў нейкім сэнсе мае свой пачатак у тым, што беларускія ўлады хацелі мяне дэпартаваць, пасьля арыштавалі пастара Антонія Бокуна. Усё гэта толькі вельмі моцна абурыла людзей. Шчыра скажу, усе тыя падзеі адбываюцца з пэўным прызначэньнем. Гасподзь Бог хоча прабудзіць хрысьціянаў і паказаць, што сапраўды ёсьць вялікае зло. Мы гэта называем духам камунізму, які застаўся тут, на Беларусі. Я веру, што сапраўды 2007 год — своеасаблівы год. Будуць адбывацца суды над тым духам камунізму, у якім ніхто не раскаяўся, якога ніхто з гэтай краіны на самой справе і не выганяў. І гэта ганьба, гэта агульнанацыянальны грэх Беларусі. А зараз адбываецца нарастаньне гэтай сьвядомасьці і волі да дзеяньня.

Я з самага пачатку маю веру, што сапраўдныя перамены ў Беларусі будуць адбывацца толькі тады, калі людзі, якія ведаюць Бога, якія маюць кантакт з Творцам, возьмуць адказнасьць за краіну, будуць актыўныя ва ўсіх грамадзкіх працэсах. Я думаю, што гэта ўжо адбываецца...

Жонка Яраслава Лукасіка разам з трыма дзецьмі засталася ў Беларусі. Наталя Лукасік пакуль змагаецца ў судах за адмену рашэньня аб дэпартацыі мужа. У яе застаўся апошні крок — зварот у Менскі абласны суд. Калі рашэньне суду чарговы раз будзе адмоўным, то Наталя разам з дзецьмі паедзе ў Польшчу да мужа, паколькі, як кажа сужонства Лукасікаў, сям’я — гэта найважнейшая каштоўнасьць.

– Мы перадусім ставім сямейныя каштоўнасьці вышэй за падзеі, што сёньня адбываюцца з намі, – кажа Н.Лукасік. – Хаця сапраўды сітуацыя вельмі непрыемная і балючая. Мы ніколі ня думалі пра тое, што давядзецца пакідаць Беларусь. У нас трое дзетак — Ян, Марцін і Міра. Яну 7 гадоў, Марціну 6, і Мірачцы 4 гадзікі. Яны вельмі сумуюць па тату. Кожны дзень у мяне пытаюцца: «Ну, калі мы нарэшце пабачымся? Мама, ты казала, што хутка, ужо прайшло шмат часу». Я іх супакойваю і расказваю пра ўсё, што адбываецца. Мы разам молімся. Я кажу ім, што тата паехаў, каб для нас усё падрыхтаваць. Таксама я кажу сваім дзецям: «Вас чакае вялікая ўзнагарода за тое, што вы маленькія, але вельмі адважныя». Гэта іх, канешне, суцяшае.

А ў мяне таксама вельмі добрая падтрымка маіх сяброў, з якімі мы ў адной царкве. Многія пастары тут, у Менску, тэлефануюць і пытаюцца, чым яны могуць нам дапамагчы. Заўсёды кажуць, што яны моляцца за нас, яны падтрымліваюць надзею ў маім сэрцы.



Яраслаў Лукасік з сям'ёй.

# Каб зьбіць хвалю моладзевага пратэсту

## Як КДБ дзейнічае супраць маладых актывістаў у Пінску

28 чэрвеня сябар Пінскай гарадзкой арганізацыі Партыі БНФ Зьміцер Бадзевіч паведаміў Радыё Свабода, што за ім сочаць невядомыя ў цывільным. Са словаў актывіста, напярэдадні яму тэлефанавалі з КДБ і прапаноўвалі прыйсьці на гутарку. А яшчэ раней, кажа юнак, супрацоўнікі сьпецслужбы наведвалі прадпрыемства, дзе ён працуе, пагражалі звальненьнем.

Перасьлед з боку КДБ працягваецца, кажа Зьміцер Бадзевіч: "Тэлефануюць, прапануюць сустрэцца. Нібыта гэта ў маіх інтарэсах, каб прыйсьці да іх. Я ня ведаю, у чым мая зацікаўленасьць у КДБ. Было й такое, што выклікалі на працу — нібыта за палітычную дзейнасьць. Дырэктар кажа, што патрабавалі звольніць. Але ён рабіць гэтага не жадае".

Праблемы цяпер і ў вучня 11-га класу Пінскай сярэдняй школы Зьмітра Кісяля. Падчас канцэрту ў Дзень моладзі ў Пінску ён раздаваў значкі і стужкі "За Свабоду". Віншавалі людзей са сьвятам. Пасьля гэтага ў гарвыканкам выклікалі дырэктара школы.

Зьміцер так гаворыць пра перасьлед: "Яны вымушаюць, каб я зьнішчыў усе свае артыкулы і свой асабісты дзёньнік у Інтэрнэце. І перастаў трымаць сувязь з рэдакцыяй нашай пінскай незалежнай газеты "Мясцовы час". За вучобу яны пад мяне падкапацца ня могуць — усё добра. Таму толькі так душаць".

Ужо некалькі дзён сябры Партыі БНФ і арганізацыі "Моладзь БНФ" працуюць валанцёрамі ў Пінску на могілках па вуліцы Спакойная. Старшыня суполкі БНФ Аляксандр Рамановіч паведамляе, што нават тут за імі віжуюць: "Мы хадзілі на магілу Скірмунта. І пасьля таго, як разьвесілі вянкі, нас спыніла міліцэйская аўтамашына. Выйшаў лейтэнант міліцыі. Ён сказаў, што ў суседняй вёсцы невядомыя скралі ровар. Мы нібыта падазраваныя ў гэтым. І што яму трэба перапісаць нашыя прозьвішчы".

Усяго на Берасьцейшчыне сёлета больш як сто маладых сяброў апазіцыі прыцягнутыя ўладай да адміністрацыйнай адказнасьці.

Падставы тлумачыць праваабаронца Уладзімір Вялічкін: "Калі ўвялі кантрактную сістэму, то старэйшае пакаленьне апынулася пад вялікім прэсінгам. Улады з гэтага боку пагрозу прыбралі. Каб зьбіць хвалю моладзевага пратэсту, дзейнічаюць інакш. Для іх трэба, каб малады чалавек ня ўдзельнічаў у дэманстрацыях, мітынгах, не раздаваў улёткі. Ім лепш, каб ён гарэлку піў, няхай коле наркотыкі. Пра якое разьвіцьцё асобы можна ў такой краіне гаварыць?!"

# На "прафілактыку" – да патэнцыйных злачынцаў

## Грамадзкага актывіста з Берасьця прымушаюць паехаць у летнік для непаўнагадовых, якія знаходзяцца на ўліку ў міліцыі

25 чэрвеня навучэнцу Берасьцейскага політэхнічнага каледжу Міхасю Ільіну куратар сказаў прыйсьці 27 чэрвеня ці то на размову, ці то на педсавет у сувязі з тым, што ён стаіць на ўліку ў камісіі па справах непаўнагадовых за ўдзел у несанкцыянаваных мерапрыемствах.

26 чэрвеня праваабаронца Уладзімір Вялічкін прыйшоў у каледж і высьветліў, што ў Міхася з вучобай і наведваньнем заняткаў праблемаў няма, аднак службовая асоба з кабінету сацыяльнага педагога і псіхолага сказала, што навучэнец нібыта злоўжывае сьпіртным... У.Вялічкін абурыўся, бо асабіста ніколі ня бачыў Міхася п'яным, настаўнікі, да якіх ён зьвяртаўся, таксама нічога падобнага не заўважалі. Тады сп. Вялічкін зьвярнуўся да намесьніцы дырэктара па выхаваўчай працы Людмілы Волікавай, якая неахвотна пацьвердзіла, што сапраўды Міхась стаіць на ўліку ў камісіі па справах непаўнагадовых Маскоўскага раёну г. Берасьця і менавіта за ўдзел у несанкцыянаваных мерапрыемствах: "Ён такі адзіны на ўвесь каледж, раней, праўда, быў яшчэ адзін – на выбарах улёткі вазіў, за што яго і затрымалі". Людміла Волікава пацьвердзіла, што 27 чэрвеня з вучнямі, якія знаходзяцца на ўліку, будзе праводзіцца размова наконт правядзеньня летняга адпачынку, ім будзе прапанавана ўзяць удзел у летніку для непаўнагадовых, якія знаходзяцца на ўліку ў камісіі, каб яны не бадзяліся без нагляду і не ўчынілі злачынстваў. Яна таксама лічыць, што ўдзел у мерапрыемствах, якія праводзіць апазіцыя, супярэчыць Канстытуцыі, бо такім чынам выкарыстоўваецца моладзь, у якой яшчэ нясьпелая сьвядомасьць.

Тлумачэньні, чаму бацькі не праінфармаваныя аб пастаноўцы іх сына Міхася на ўлік, былі яўна надуманымі, бачна, што інфармаваньне бацькоў у планы адміністрацыі каледжу не ўваходзіла, бо бацькі... таксама апазіцыянеры.

Уладзімір Вялічкін так пракаментаваў сітуацыю, што склалася: "Адміністрацыя школы па ўказцы з аддзелу прафілактыкі Маскоўскага РАУС г. Берасьця і камісіі па справах непаўнагадовых пры адміністрацыі Маскоўскага раёну праводзіць "прафілактычную" працу з Міхасём Ільіным. Жах бярэ, калі бачыш, што беларускія ўлады хлопца, які ня п'е, ня курыць, ня крадзе, ня лаецца, не парушае правапарадак і не ўчыняе злачынстваў толькі за тое, што мае іншыя ад "дзяржаўных" погляды, хочуць "паламаць", па крымінальнаму "апусьціць" – зьмясьціць ў асяродзьдзе той моладзі, якая менавіта п'е, курыць, колецца, нюхае, крадзе, лаецца, б'ецца, парушае правапарадак і ўчыняе злачынствы. Які можа быць вынік такога "выхаваньня", мяркую, каментаваць не патрэбна, я сам педагог па адукацыі і мяне гэта абурае! Хай вынаходнікі гэтага метаду ў такіх летніках сваіх дзяцей выхоўваюць!"

# Пратэставаць забаронена...

## У пасёлку Дружны Пухавіцкага раёну сарваны сход удзельнікаў ліквідацыі аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

**28 чэрвеня ўвечары ў пасёлку Дружны, што ў Пухавіцкім раёне, сарваны сход удзельнікаў ліквідацыі аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Напярэдадні ўлады дазволілі сустрэчу ў мясцовым Доме культуры з Аляксандрам Валчаніным, лідэрам грамадзкага аб'яднаньня "Ліквідатар", пытаньне пра рэгістрацыю якога цяпер разглядае Міністэрства юстыцыі.**

**Аднак сёньня, як паведаміў Радыё Свабода спадар Валчанін, улады зьмянілі рашэньне, не прапанаваўшы ўзамен іншага памяшканьня. Больш як паўсотні чалавек, што прыйшлі на сход, прапанавалі правесьці яго пад адкрытым небам. Ліквідатары выказалі пратэст запланаванай адмене льготаў для чарнобыльцаў, якіх у Дружным пражывае каля 600 чалавек.**

**Тым часам, менавіта ў гэты ж дзень – 28 чэрвеня – прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін узнагародзіў вялікую групу чарнобыльцаў ордэнамі і медалямі з фармулёўкай "за мужнасьць падчас ліквідацыі наступстваў аварыі на ЧАЭС".**

# Інфармацыйная правакацыя

## Першага Нацыянальнага тэлеканалу

У чатырох актывістаў беларускай апазіцыі, якія вучацца ў Польшчы, на мытні сканфіскаваны два ноўтбукі з электроннымі дапаможнікамі па тэрарызме", – паведаміў у нядзелю Першы нацыянальны тэлеканал.

По дадзеных тэлеканалу, ва ўтоеных файлах, выяўленых у ноўтбуку аднаго з затрыманых, знаходзілася электронная энцыклапедыя мін і выбухоўнікаў, "Настольная кніга тэрарыста", матэрыялы па правядзеньні тэрактаў, а таксама кніга "100 спосабаў самагубства". Аб зьмесьце другога ноўтбука, вынятага ў затрыманых, нічога не паведамляецца.

Як паведамляе "Інтэрфакс", па факце выяўленьня электронных дапаможнікаў па тэрарызьме на беларуска-польскай мяжы былі затрыманыя прэс-сакратар апазіцыйнай незарэгістраванай арганізацыі "Малады фронт" Барыс Гарэцкі, актывіст Гарадзенскагай філіі МФ і двое сяброў Партыі БНФ.

Як паведаміў Праваабарончаму цэнтру "Вясна"кіраўнік наваполацкай філіі "Моладзі БНФ" Аляксей Трубкін" дзяржаўны тэлеканал недобрасумленна выкарыстаў у сваім паведамленьні састарэлыя зьвесткі. Ноўтбукі сапраўды былі затрыманыя на мытні ў Брузгах, але яшчэ ў сьнежні мінулага году. Дагэтуль вядзецца перапіска з мытняй і пракуратурай аб іх вяртаньні законным уладальнікам. Пра новыя затрыманьні Барыса Гарэцкана і іншых актывістаў нічога невядома. Тэлефон прэс-сакратара Маладога Фронту Барыса Гарэцкага пакуль не адказвае, верагодна ён зараз знаходзіцца ў Страсбургу, дзе прымае ўдзел у міжнароднай канферэнцыі няўрадавых арганізацыяў пры Радзе Еўропы.

Навошта было патрэбна рабіць такую інфармацыйную правакацыю – невядома.

# Сяргея Салаша бяруць у "распрацоўку"

Цягам двух апошніх дзён у барысаўскую раённую пракуратуру на допыты выкліканыя васьмёра мясцовых апазыцыйных актывістаў, паплечнікаў лідэра барысаўскай суполкі Партыі БНФ Сяргея Салаша. Позвы ў пракуратуру атрымалі Зьміцер Бабіцкі, Сяргей Сацук, Зьміцер Мацельскі, Алег Мацкевіч і іншыя.

На позвах не напісана ў якасьці каго ўсе яны выклікаюцца. Калі Алег Мацкевіч запытаўся пра гэта, яму сказалі, што выклікаюцца "проста так, па справе дзейнасьці Сяргея Салаша". На пытаньне Мацкевіча, ці крымінальная гэта справа, у пракуратуры не адказалі. Справу будзе весьці сьледчая І.Пашкевіч.

Сам Сяргей Салаш наступным чынам каментуе гэтую сітуацыю: 'Відавочна, што ьспецслужбы ўзялі мяне ў распрацоўку. Цяпер спрабуюць "прышыць" мне нейкія незаконныя дзеяньні. Кажуць, што мяне шукаюць з красавіка, але ніякіх папераў ці выклікаў у пракуратуру я не атрымліваў. Для мяне абсалютна зразумела, што гэта ўсё зьвязана з сёлетнімі мясцовымі выбарамі. Калі нашай камандзе атрымалася правесьці досыць удалую выбарчую кампанію, мясцовая вертыкаль зразумела, што мы ў стане перамагаць".

Нагадаем, што першапачаткова пасьля мясцовых выбараў прайшла інфармацыя пра перамогу на адным з барысаўскіх участкаў эканаміста Зьмітра Бабіцкага, аднак літаральна праз два дні высьветлілася, што на 22 галасы перамог ягоны канкурэнт. Сяргей Салаш тады быў кіраўніком ініцыятыўнай групы Бабіцкага. За некалькі дзён да галасаваньня Салаша асудзілі да пяці сутак арышту за дробнае хуліганства, ён выйшаў з турэмнага ізалятару ўжо пасьля галасаваньня.

# "Я буду ісьці датуль, дакуль хопіць сілаў і будзе сэнс"

*(Пачатак на стар. 3)*

кватэрах, калі сама сёлета балатавалася ў гарсавет. Людзі нават цалавалі нас – вельмі ўражвалі тыя радасьць і хваляваньне грамады.

***– Ну а як паводзілі сябе тыя настаўнікі, каму "даверылі" камісіі?***

– Я назірала за імі ў нашай школе – гэта чацьвёрты ўчастак. Выседзела ўсе пяць дзён датэрміновага галасаваньня і сам дзень выбараў. Бачыла: ад іх нічога не залежала. Усё вырашала сакратар камісіі, якая "падлічвала" галасы. З таго часу з ёй не вітаюся – вельмі непрыемна было назіраць, як сваім далікатным пальчыкам ціскала на кнопачкі не зьвяртаючы аніякае ўвагі на лічбы, што называліся падлікоўцамі. Проста выводзіла ёй замоўленую. Я пабачыла вялікі спэктакль, дужа дарагі для нашага народу фарс. Ва ўсіх сэнсах гэтага слова.

***– Каго хочуць запалохаць вашым выцісканьнем са школы?***

– Астатніх маіх калегаў. Не са мной тая барацьба, як я разумею. Гэтак змагаюцца з усімі тымі, хто супраць. Хто мысьліць інакш, чымсьці хоча сістэма. Ня церпіць яна цьвярозых, здольных да крытыкі...

***– На якія сродкі будзеце жыць далей?***

– Звальненьне прыйшлося на той час, калі я ўжо зарабіла сабе пенсію, хай сабе і невялічкую. Ну, давядзецца падцісунцца, але нічога – ёсьць яшчэ сілы і галава. Не пасаромеюся заняцца і не такой ганаровай працай, як настаўніцтва. Нічога: як трэба жыць, дык трэба і працаваць.

***– Што скажаце пра кантракты для настаўнікаў?***

– Калі іх увялі тры гады таму, я абышла ўсе магчымыя віцебскія інстанцыі: начальніку аблана паказвала закладзеную туды бязглуздзіцу, непаважлівыя адносіны да нас. Казала: як можна так абыходзіцца з настаўнікамі, прыніжаць іх? Ну і чаго дабілася? Са мной заключылі асабісты кантракт, выключыўшы тыя пункты, якія мяне абуралі. Але сваё абурэньне я пацьвердзіла шматлікімі юрыдычнымі выпіскамі, што сьведчылі на карысьць маёй аргументацыі. Праўда, заключылі яго ўсяго на адзін год. Зноўку ўзбурылася, падняла ўсіх – падоўжылі на два гады. Не далі, праўда, пару месяцаў дапрацаваць – раптоўна стала дужа вялікай "прагульшчыцай".

***– Хто для вас, як для беларускі, цяпер вораг нумар адзін?***

– Не хачу казаць, што гэта нейкая асоба. На жаль – самі беларусы. Тая большасьць, абыякавая большасьць, якой усё роўна, што адбываецца ў грамадзкім асяродку, што стане з іхнімі дзеткамі, якія баяцца і страшацца ўладаў... Той вораг у іх саміх сядзіць – псіхалогія раба...

***– Каго з іншых моладзевых лідэраў вы лічыце моцнымі і перспектыўнымі?***

– Ведаю Дзіму Дашкевіча, Барыса Гарэцкага, Зьміцера Хведарука, Артура Фінькевіча, Насту Палажанку, Пашу Красоўскага, іншых – нехта з іх ужо ўступіў у паўналецьце, камусьці яшчэ няма і шаснаццаці... Але насамрэч гэта вельмі моцныя людзі. Яны ўжо сталей за тых дарослых, хто прыгнечаныя той самай абыякавасьцю. Дарэчы, са старэйшых лідэраў я б назвала яшчэ Вольгу Карач.

***– І напрыканцы: у што вы верыце, спадарыня Тацяна?***

– Веру ў Бога, у праўду, у справядлівасьць.

# "Партнёрства", Малады Фронт, "ЗБС"?

## Актывістаў пазбаўленага рэгістрацыі "Задзіночаньня беларускіх студэнтаў" пачалі выклікаць у пракуратуру

20 чэрвеня раніцай супрацоўнікі міліцыі і людзі ў цывільным затрымалі каля сваіх дамоў і даставілі ў Менскую гарадзкую пракуратуру трох моладзевых актывістаў: Яўгена Іванюка, Анастасьсю Шамарэй і Надзею Манцэвіч.

Як стала вядома ПЦ "Вясна", усім ім былі вынесены афіцыйныя пракурорскія папярэджаньні, у якіх, у прыватнасьці, гаворыцца пра тое, што, "паводле інфармацыі, якой валодае пракуратура Менскай вобласьці, маладзёны маюць намер арганізаваць і прыняць удзел у дзейнасьці незарэгістраванай арганізацыі "Заадзіночаньне беларускіх студэнтаў", у дачыненьні да якой маецца ўступіўшае ў законную сілу рашэньне Вярхоўнага суда рэспублікі Беларусь аб ліквідацыі аб'яднаньня. Між тым артыкул 193.1 КК РБ прадугледжвае крымінальную адказнасьць за ажыцьцяўленьне такой дзейнасьці. Паводле Закону аб пракуратуры, у яе работнікаў ёсьць права выносіць папярэджаньні аб недапушчальнасьці падобнай дзейнасьці. У адваротным выпадку моладзь можа быць прыцягнутая да крымінальнай адказнасьці. Папярэджаньні падпісаў намесьнік пракурора гораду Менску старэйшы саветнік юстыцыі А. Стук.

Яўген Іванюк кажа, што першыя званкі пачаліся напярэдадні суда над актывістамі Маладога Фронту. Дванаццаць чалавек мусілі наведваць пракуратуру амаль штодня цягам апошняга тыдня. Ня ўсе пагадзіліся прыйсьці бяз позвы. Тым, хто прыйшоў, сп-ня Куксо ўручыла папярэджаньне. Гаворыць Яўген Іванюк: "Далі паперу, у якой напісана: "У менскай гарадзкой пракуратуры маецца інфармацыя аб тым, што вы зьбіраецеся арганізаваць і дзейнічаеце ў арганізацыі "Задзіночаньне беларускіх студэнтаў", якая была ліквідаваная ў 2001 годзе... Мы вас афіцыйна папярэджваем, што ў Крымінальным кодэксе ёсьць артыкул і, калі вы будзеце працягваць, мы вас прыцягнем да адказнасьці за ўдзел у незарэгістраванай арганізацыі". Ну, гэта, хутчэй за ўсё, спроба запалохаць усе моладзевыя арганізацыі, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Наўрад у іх гэта атрымаецца, таму што моладзь усё роўна будзе зьбірацца і ладзіць свае акцыі".

Актывісты зьліквідаванай студэнцкай арганізацыі лічаць, што супрацоўнікі КДБ маюць сьпісы некаторых сяброў ЗБС. Сьпісы складаліся ў міліцыі пасьля затрыманьняў.

Нагадаем, што летась 22 сьнежня сьпецназаўцы затрымалі каля дваццаці актывістаў згуртаваньня падчас вечарыны ў прыватнай кватэры і адвезьлі ўсіх у міліцыю Савецкага раёну. Некалькі чалавек, у тым ліку Алеся Міхалевіча, абвінавацілі ў дробным хуліганстве.

Сёлета 10 лютага супрацоўнікі КДБ і міліцыі затрымалі больш за тры дзесяткі актывістаў арганізацыі, калі тыя за горадам намагаліся правесьці ўстаноўчы сход.

Актывісты ЗБС не выключаюць, што пракуратура можа ў хуткім часе распачаць крымінальную справу супраць некалькіх сяброў арганізацыі. У гэтым выпадку ЗБС стане трэцяй моладзевай арганізацыяй пасьля "Партнёрства" і Маладога Фронту, сяброў якой прыцягнулі да крымінальнай адказнасьці за ўдзел у незарэгістраванай арганізацыі.

# "Каму выгадна руйнаваць Гародню?"

"Круглы стол" пад такой назвай прайшоў у Горадні. Арганізатары– Беларускае гістарычнае таварыства, рэдакцыя часопісу "Гістарычны альманах" і Гарадзенскае гарадзкое адзьдзяленьне рэспубліканскага ГА "Таварыства беларускай школы" – прапанавалі паўдзельнічаць у мерапрыемстве ўсім ахвотным. Напачатку выступаючыя казалі аб тым, што ў Гародні зьнішчана ў апошнія гады. Улады "рэканструююць" горад, не зважаючы нават на падпісаны прэзідэнтам дакумент, які забараняе падобную рэканструкцыю. І ў навукоўцаў, і звычайных грамадзянаў Гародні было шмат прапановаў па выратаваньні гістарычнай часткі гораду. Доктар гістарычных навук, ініцыятар "круглага стала" Алесь Смалянчук запэўніў прысутных, што ўсе парады будуць выкарыстаны дзеля выратаваньня гістарычнага ядра старажытнага гораду. Паводле сустрэчы была прынятая рэзалюцыя, у якой, зважаючы на крытычную сітуацыю з захаваньнем гісторыка-культурнай унікальнасьці Старога гораду, удзельнікі круглага стала запатрабавалі ад абласных і гарадзкіх уладаў дакладнага выкананьня Генеральнага плану разьвіцьця Гародні, стварэньня рэстаўрацыйных структураў, шырокага абмеркаваньня праблемы "рэканструкцыі" у СМІ.




# Гэта вынік памылкі альбо правакацыі

***Больш за сто студэнтаў Гарадзенскага ліцэю і Гарадзенскага дзяржаўнага унівэрсітэту падпісаліся пад лістом з просьбай вызваліць Маргарыту Царан.***

Як мы паведамлялі, 20-гадовую дзяўчыну асудзілі на чатыры гады зьняволеньня за пакупку марыхуаны вагой 0,28 грама. Падпісанты звароту лічаць, што прысуд былой студэнтцы універсітэту несправядлівы, а крымінальная справа супраць яе — вынік памылкі альбо правакацыі. Мэтай міліцыі было выкрыць універсітэцкага выкладчыка, які прадаваў наркотыкі, і Маргарыту проста выкарысталі.

Выкладчык права Андрэй Здасюк зьнік, а пад суд трапіла студэнтка, якую пасадзілі на чатыры гады.

Адкрыты ліст у абарону Маргарыты Царан гарадзенскія выкладчыкі і студэнты даслалі кіраўніку краіны, а таксама генеральнаму пракурору і старшыні Вярхоўнага суда.

Подпісы пад заклікам вызваліць Маргарыту Царан і даць ёй магчымасьць вярнуцца на вучобу паставілі сярод іншых студэнты Руслан Коўтун і Улада Дырда, якія вучыліся з дзяўчынай.

"Права на волю". Праваабарончы бюлетэнь. Выходзіць два разы на месяц на беларускай і рускай мовах.
Наклад 299 асобнікаў. Пры перадруку спасылка на бюлетэнь абавязковая.